View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

Государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы»

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ

Сборник научных трудов

Выпуск 1

Минск
РИВШ
2017

УДК 94(47/49)«18»(082)
ББК 63.3(45)6я43
Д64

Сборник основан в 2017 г

Рекомендовано
редакционно-издательской комиссией
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 5 от 26 октября 2017 г.)

Редакционная коллегия:
чл.-кор. НАН Беларуси, д-р ист. наук проф. *И. А. Марзалюк* (пред.);
д-р ист. наук проф. *В. С. Кошелев;*
д-р ист. наук проф. *В. А. Космач;*
д-р ист. наук проф. *В. И. Яковчук;*
д-р ист. наук проф. *А. М. Лютый;*
д-р ист. наук проф. *Г. Г. Лазько;*
д-р ист. наук проф. *С. И. Никонова* (РФ, Казань);
д-р ист. наук *О. Мастяница-Станкевич* (Литва, Вильнюс);
канд. ист. наук доц. *В. А. Сосно;*
канд. ист. наук доц. *В. А. Теплова;*
канд. ист. наук доц. *С. Ф. Шимукович*

Д64 **«Долгий** XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. Вып. 1 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 210 с.
ISBN 978-985-586-106-6.

Сборник научных трудов издается в рамках выполнения задания 1.1.03 «История и культура» подзадания 1.1.03.3 «Формирование элит на территории Беларуси в XIX – начале XX века» (номер госрегистрации 20160828) государственной программы научных исследований «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» на 2016–2020 гг. Содержит научные статьи, в которых ученые-историки Беларуси, России и Литвы рассматривают разные аспекты развития Восточной Европы и территории современной Беларуси в интересный, насыщенный событиями исторический период, обозначенный Э. Хобсбаумом как «долгий XIX век».

Адресован профессиональным и начинающим исследователям, преподавателям, студентам и всем, кто интересуется историей нового времени Беларуси.

**УДК 94(47/49)«18»(082)**
**ББК 63.3(45)6я43**

**ISBN 978-985-586-106-6**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

*Цуба Міхаіл*
УА «Палескі дзяржаўны ўніверсітэт», Пінск, Беларусь

*Tsuba Michail*
Polessky State University, Pinsk, Belarus

**УДК 947.6(=411.6)«1914/1916»**

## СТАЎЛЕННЕ САМАДЗЯРЖАЎЯ І ПРАВЫХ ШАВІНІСТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ Ў 1907–1914 ГАДЫ

## THE ATTITUDE OF THE AUTOCRACY AND THE RIGHT CHAUVINISTIC ORGANIZATIONS TO THE BELARUSIAN REVIVAL IN 1907–1914

*Артыкул адлюстроўвае разнастайнасць раней маладаследаваных праблем, звязаных з сістэматычнымі ганеннямі, рэпрэсіямі, адміністрацыйнымі забаронамі з боку царскіх улад і пастаяннымі нападкамі з боку правых расійскіх і польскіх шавіністычных арганізацый на беларускі нацыянальны рух у паслярэвалюцыйны перыяд (1907–1914). Асаблівая ўвага надаецца ўмовам і абставінам, якія мелі месца падчас даследуемага перыяду, а таксама формам і метадам дзейнасці антыбеларускіх сіл, накіраваных супраць беларускага нацыянальнага адраджэння.*
*Ключавыя словы: самадзяржаўе; шавіністычныя арганізацыі; беларускае адраджэнне; рэпрэсіі; царскія ўлады; беларускія губерні; Дзяржаўная дума.*

*This article reflects a variety of previously insufficiently explored problems associated with systematic persecutions, repressions, administrative prohibitions from the side of the tsarist authorities and constant attacks by right-wing Russian and Polish chauvinist organizations on the Belarusian national movement in the post-war period 1907–1914.*

*Particular attention is paid to the conditions and circumstances that took place during the investigated period , as well as to the forms and methods of activity of anti-Belarusian forces directed against the Belarusian national revival.*
*Keywords: Autocracy; chauvinist organizations; Belarusian revival; repressions; tsarist power; Belarusian gubernias; state Duma.*

Рэвалюцыя 1905–1907 гадоў садзейнічала абуджэнню і пашырэнню нацыянальна-вызваленчых працэсаў як у беларускіх губернях, так і па-за іх межамі. Згодна з Законам «Аб свабодзе друку», выдадзеным царскім урадам падчас рэвалюцыйных падзей, дазвалялася друкаваць творы беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі на роднай мове, у выніку чаго былі заснаваны беларускія выдавецтвы на роднай мове «Загляне сонца і ў наша аконца» ў Пецярбургу і «Наша хата» ў Вільні. Аднак гэта

толькі частковыя ўступкі самадзяржаўя падчас рэвалюцыі, якія пасля яе паражэння былі значна абмежаваны і ўрэзаны. У паслярэвалюцыйны перыяд (1907–1914) гісторыя беларускага нацыянальнага руху непарыўна была звязана з сістэматычнымі ганеннямі, рэпрэсіямі, адміністрацыйнымі забаронамі з боку царскіх улад і пастаяннымі нападкамі з боку правых расійскіх і польскіх шавіністычных арганізацый.

Царскія ўлады, праводзячы вялікадзяржаўную палітыку на заходніх ускраінах імперыі, рабілі ўсе захады, каб стрымаць развіццё інтэлектуальных сіл беларускага народа, перашкаджалі стварэнню ў беларускіх губернях навуковых, навучальных і культурна-асветніцкіх устаноў. Любыя праявы беларускага нацыянальнага руху, нават у культурна-асветніцкай справе, абмяжоўваліся цэнзурнымі дамаганнямі і знаходзіліся пад пільным наглядам паліцэйскіх улад. Вось як аб становішчы ў беларускіх губернях у гэты час сведчыць вядомы гісторык М. В. Доўнар-Запольскі: «Цяжкая, прыгнятаючая рука царскага ўраду не дазваляла тут ствараць навуковыя цэнтры, разганяла інтэлігентных работнікаў, зганяла сюды русіфікатараў, цікавілася краем толькі з паліцэйскага пункта гледжання, таму нават нашыя губернскія цэнтры ў навуковых і грамадскіх адносінах далёка адставалі ад губернскіх цэнтраў Украіны ці Вялікаросіі» [1, с. 1].

Найбольш важным кірункам русіфікатарскай палітыкі была забарона беларускай мовы і распаўсюджванне рускай. Напрыклад, у часопісе Камітэта Міністраў з нагоды выканання §7 Іменнага ўказа ў адносінах да заходніх губерняў падкрэслівалася: «Расійскай мове, як дзяржаўнай, павінна быць, па перакананню Камітэта, і далей па-ранейшаму забяспечана пануючае становішча. Неабходнасць гэтага выцякае з факта прыналежнасці края да Расійскай дзяржавы і ўсведамлення, што заходнія губерні, якія здаўна ўваходзілі ў яе склад, маюць у значнай сваёй частцы спрадвечна рускае насельніцтва» [2, арк. 586]. У 1906 годзе Дзяржаўная дума дазволіла навучанне на роднай мове палякам, армянам, чэхам, грузінам, буратам, калмыкам і яўрэям. Аднак беларусам і ўкраінцам было адмоўлена ў праве мець школу на роднай мове. Па-беларуску можна было вучыцца толькі ў прыватных школах. Такія падыходы садзейнічалі выкарыстанню рускай мовы ў самых розных сферах: дзяржаўнай, грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, рэлігійна-культавай і бытавой. У барацьбу за «ўвядзенне рускага элемента» і ператварэнне Беларусі ў «сапраўдны рускі край» уключыліся не толькі царскія чыноўнікі, але і праваслаўнае духавенства, якое ў сваёй большасці выступала за ўмацаванне манархічных і праваслаўных асноў расійскай дзяржаўнасці. Такая палітыка вяла да асіміляцыі і бязграматнасці беларускага народа, а таксама да заняпаду яго культуры.

У гады рэакцыі ў большасці беларускіх губерняў было ўведзена надзвычайнае становішча. Царская адміністрацыя на месцах (генерал-губер-

натары, губернатары і граданачальнікі) атрымала права выдаваць «абавязковыя пастановы», якія мелі сілу закона. Для барацьбы з «іншадумствам» і рэвалюцыйным рухам толькі ў Мінскай губерні (кастрычнік 1907 года) у баявой гатоўнасці знаходзіліся 4 палкі пяхоты, 6 спецыяльных рот салдат і 2 артылерыйскія брыгады. Праводзіліся шматлікія вобыскі і арышты «палітычна ненадзейных». Турмы былі перапоўнены. Толькі за 1908 год праз Мінскую турму прайшло больш за 24 тысячы чалавек. Большасць з іх была арыштавана па палітычных справах [3, арк. 87–102]. У многіх паветах і буйных гарадах аж да 1909 года працягвала дзейнічаць «Палажэнне аб узмоцненай і надзвычайнай ахове».

Правадніком і натхняльнікам барацьбы супраць адраджэнскіх працэсаў і рэвалюцыйных настрояў з'яўляўся старшыня Савета Міністраў П. А. Сталыпін, які з лета 1907 года ўзвёў вялікадзяржаўны шавінізм у ранг афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі. Гэта ярка праявілася ў ходзе выбарчай кампаніі (восень 1907 года) у III Дзяржаўную думу. Падчас яе асаблівасці палітычнай тактыкі былі звязаны са спецыфікай нацыянальнага сацыяльна-класавага складу насельніцтва, у першую чаргу пануючых класаў, і імкненні самадзяржаўя зменшыць ролю палякаў і яўрэяў у палітычным і эканамічным жыцці краю. Гэтым тлумачацца тыя змены, якія былі ўнесены ў новы выбарчы закон. У адпаведнасці з ім выбаршчыкі на заходніх губернях былі падзелены не толькі па класавым, але і па нацыянальным прынцыпе. Каб забяспечыць перамогу «рускіх», урад прадугледзеў стварэнне ў Віленскай губерні, дзе пераважала каталіцкае насельніцтва, асобнай «рускай» курыі і забяспечыў ёй два абавязковыя месцы ў Думе. У Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях утвараліся «рускае» і «польскае», а ў гарадах – і яўрэйскае аддзяленні [4, с. 75–76].

Да «рускіх» аддзяленняў былі далучаны праваслаўныя беларусы, татары, немцы, літоўцы і інш., да «польскіх» – беларусы-католікі. Такім чынам, беларускі народ быў падзелены на «рускіх» і «палякаў». З мэтай загітавання насельніцтва за праўрадавых прадстаўнікоў самадзяржаўе з дапамогай чарнасоценна-акцябрысцкіх груповак на месцах разгарнула шырокую прапагандысцкую кампанію, у ходзе якой чарнасоценным арганізацыям было прадастаўлена права наладжвання сходаў у казённых памяшканнях «для абмеркавання пытанняў аб выбарах у Дзяржаўную думу, а таксама аб паездках членаў (чарнасоценскага) таварыства па сёлах і вёсках... для аб'яднання дзейнасці насельніцтва і для паднісання ўсімі жыхарамі (у дадзеным выпадку Бабруйскага павета) вернападданніцкай на імя Гасудара тэлеграмы». Прычым ставілася пытанне і аб узбраенні чарнасоценскіх агітатараў рэвальверамі за кошт дзяржавы [5, арк. 621, 623]. У выніку «рускае» насельніцтва атрымала перавагу на выбарах. У Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях праўрадавыя вылучэнцы-чарнасоценцы і акцябрысты правялі ў III Дзяржаўную думу

27 з 29 дэпутатаў. Да іх далучыліся два чарнасоценцы, выбраныя ад «рускага» насельніцтва Віленскай губерні. Астатнія выбаршчыкі гэтай губерні аддалі свае галасы пяці кандыдатам групоўкі польска-беларускіх памешчыкаў і ксяндзоў [4, с. 81].

Вялікую ўвагу ў гэты перыяд надавала самадзяржаўе і выбарам у Дзяржаўны савет. Значная перавага тут буйных землеўласнікаў польскага паходжання давала ім магчымасць выбіраць на дваранскіх сходах у Дзяржаўны савет амаль толькі сваіх прадстаўнікоў. З гэтай нагоды ўрад, абапіраючыся на фракцыю чарнасоценцаў-акцябрыстаў у III Дзяржаўнай думе, увёў у 1911 годзе ў заходніх губернях земствы. Вось як аб гэтым расказвала «Наша ніва»: «На акцябрыстаў цяпер вельмі востра нападаюць усе, кажучы, што яны ўсё рабілі паводле жадання старшыні міністраў Сталыніна. Так, жаданнем выслужыцца перад ім тлумачаць тое, што акцябрысты зацвердзілі яго праект аб земствах у 6-ці заходніх губернях» [6, с. 1]. Ствараючы земствы па выбарчай сістэме, якая забяспечвала перавагу «рускага элемента», урад спадзяваўся не толькі на станоўчы для сябе вынік выбараў у Дзяржаўны савет, але і на пашырэнне манархічнай ідэалогіі на месцах. Неабходна адзначыць, што пэўныя надзеі на абнаўленне, звязаныя з земствамі, ускладала і «Наша ніва», якая пісала: «... усімі справамі, што дагэтуль былі ў руках чыноўнікаў, будуць запраўляць выбарныя людзі... трэба, каб туды выбіралі людзей, якія шчыра захочуць і здолеюць працаваць для нашага народу, несучы ў вёску свет навукі і дапамагаючы ёй устаць на свае ногі» [7, с. 3]. Аднак адзіны цэнтр у выглядзе рэдакцыі газеты «Наша ніва», вакол якога групаваліся ўсе нацыянальна свядомыя сілы беларусаў, меў непараўнальна меншыя фінансавыя магчымасці і значна ўступаў у агітацыйным вопыце сваім больш магутным канкурэнтам – урадавым і польска-клерыкальным структурам. У выніку земствы, выбраныя ў 1911 годзе ў беларускіх губернях, былі прадстаўлены прарасійскімі і часткова прапольскімі нацыяналістамі і ў сваёй дзейнасці цалкам ігнаравалі мову, культуру і іншыя нацыянальныя адметнасці беларусаў.

На выбарах у IV Дзяржаўную думу ў 1912 годзе насельніцтва беларускіх губерняў, як і раней, было падзелена на тры курыі: «рускую», «польскую» і «яўрэйскую». У «рускую» курыю запісвалі праваслаўных беларусаў, старавераў, лютэранаў, магаметанаў; у «польскую» – беларусаў-католікаў [8, с. 1]. Вынік выбараў для беларускага нацыянальнага руху мала чым адрозніваўся ад выбараў у земствы: ніхто з дзеячаў-адраджэнцаў у IV думу не трапіў.

Адзначаныя мерапрыемствы расійскага ўрада былі накіраваны ў першую чаргу на колькаснае абмежаванне прадстаўнікоў польскага і яўрэйскага насельніцтва, а таксама на правядзенне на выбарах як мага большай колькасці прадстаўнікоў праўрадавай арыентацыі. Разам з тым гэта азначала адмаўленне самадзяржаўем існавання беларускай нацыі, яе

самабытнай мовы і культуры. Даволі значныя слаі праваслаўнага беларускага насельніцтва – чыноўнікі, духавенства, большасць настаўнікаў, урачоў і іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, а таксама частка сялянства, далучаныя згодна з законам да пануючых вярхоў грамадства, атрымалі пэўныя прывілеі ў параўнанні з палякамі і яўрэямі. Так, большасць мясцовых дэнацыяналізаваных прадстаўнікоў карэннага насельніцтва з ліку адукаваных слаёў (як і тыя, што прыехалі на Беларусь здалёку) працягвалі ўспрымаць беларускае адраджэнне як з'яву непатрэбную і заўчасную, як задуму вузкага кола дзеячаў культуры. Яны падтрымлівалі шавіністычную русіфікатарскую палітыку самадзяржаўя і рашуча выступалі супраць беларускага нацыянальнага руху.

У якасці навуковага абгрунтавання сваёй русіфікатарскай палітыкі царскі ўрад выкарыстоўваў ідэалогію «заходнерусізма», якая адмаўляла існаванне беларускай нацыі і беларускай мовы. Гэта ідэалогія з'яўлялася адным з кірункаў грамадскай думкі ў заходніх губернях на працягу XIX – пачатку XX ст. Згодна з яе канцэпцыяй, «Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з'яўляецца культурна і дзяржаўна часткай Расіі і таму павінна разглядацца як адзін з яе састаўных элементаў» [9, с. 7]. За перыяд свайго існавання «заходнерусізм» набыў у нашым краі нямала прыхільнікаў і выпрацаваў сваю ўласную канцэпцыю, якая супрацьстаяла беларускай нацыянальнай ідэі.

Найбольш буйным арганізацыйным стварэннем гэтай ідэалагічнай плыні з'ўлялася «Западнорусское общество», якое было заснавана 29 студзеня 1911 года ў Пецярбургу. Статут і праграма дадзенага таварыства ставілі на мэце «ўзмацненне расійскай культуры і развіццё духоўных і матэрыяльных сіл расійскай народнасці ў Заходнім краі, вывучэнне яго сучаснага становішча і мінулага» [9, с. 310]. «Западнорусское общество» сваю дзейнасць ажыццяўляла шляхам напісання і папулярызацыі навуковых прац, чытання лекцый для студэнтаў-беларусаў, правядзення палітычных сходаў у час паездак на Беларусь.

Патрэбна адзначыць, што «заходнерусізм» ніколі не быў суцэльнай аднастайнай плыняй. Ён выразна падзяляўся на два крылы. Калі прадстаўнікі правага крыла (Кулакоўскі, Бажэлка, Саланевіч, Патабня, Пшчолка, Кавалюк, Сразнеўскі, Уруцэвіч, Сабалеўскі і інш.) у асноўным займаліся палітыканствам і нападкамі на беларускае адраджэнне, то левае крыло (Сапуноў, Карскі, Раманаў, Нікіфароўскі, Стукаліч, Баброўскі, Доўнар-Запольскі і інш.), якое складалася з навукоўцаў, будучы прыхільнікамі асноў самадзяржаўя, імкнулася ў яго межах развіваць культуру і даследаваць гісторыю сваёй Бацькаўшчыны-Беларусі. Такая двайная арыентацыя прыводзіла да супярэчнасцяў і расколу як унутры саміх груповак «заходнерусізма», так і ў ідэалагічнай платформе плыні ў цэлым. Напрыклад, прадстаўнік правага крыла Ц. Бажэлка на старонках

«Крестьянина» апублікаваў артыкул, накіраваны адначасова супраць «Нашай нівы» і левага крыла, якому непасрэдна адрасаваны закід: «Здрайцы і прадаўцы свайго народу з шбы вучоных нам добра вядомыя!» [10, с. 2]. У сваю чаргу леваму крылу часта не хапала самых малых дробязей, а можа і часу, каб назаўсёды парваць з «заходнерусізмам» і далучыцца да беларускага нацыянальнага руху. Аб гэтым сведчыць і выступление А. Сапунова з рэфератам на тэму «Белоруссия и белорусы» (26 кастрычніка 1910 года) у Віцебскай архіўнай камісіі, дзе вучоны сказаў: «Я заклікаю Беларусь да самавызначэння, да нацыянальнага ўсьведамлення, да адроджанае будучыні, якая будзе ў руках саміх беларусаў», скончыўшы прамову прыгожым патрыятычным вершам Я. Неслухоўскага [11, с. 167].

Нягледзячы на некаторыя станоўчыя моманты для беларускай культуры і навукі, якія мелі месца ў гэтай плыні ў сувязі з наяўнасцю ў ёй прадстаўнікоў левага крыла, усё ж неабходна адзначыць, што, дзякуючы дзейнасці ідэалогіі «заходнерусізма», самадзяржаўю ў многім удалося адурманіць і павесці за сабой значную частку беларускага насельшцтва.

Заўзятымі прыхільнікамі гэтай ідэалогіі таксама з’яўляліся праманархічныя чарнасоценна-акцябрысцкія партыі («Союз русского народа», «Всероссийский национальный союз», «Русское окраинное общество», «Совет объединённого дворянства»), якія надавалі вялікую ўвагу барацьбе з нацыянальнымі рухамі, «іншародніцкім засіллем», выступалі за скасаванне Маніфеста 17 кастрычніка [12, с. 63]. Галоўная задача палітыкі расійскага ўрада і дадзеных партый заключалася ў тым, каб задушыць вызваленчы рух, прывесці да поўнай пакорнасці ўсе нярускія народы Расійскай імперыі, паралізаваць іх волю да барацьбы за нацыянальнае раўнапраўе.

З гэтай мэтай у многіх гарадах пачалі ўзнікаць своеасаблівыя філіялы названых вышэй партый («Крестьянин», «Белорусское общество», «Бобруйское Христианское общество» і інш.) [13, арк. 608]. Дадзеныя аргашзацыі аб’ядноўвалі ў асноўным чыноўнікаў, праваслаўных дзеячаў, памешчыкаў і заможныя пласты беларускага сялянства. Нягледзячы на пэўныя супярэчнасці па асобных пытаннях, іх палітычная праграмма, скіраваная на абарону асноў самадзяржаўя на Беларусі, заставалася нязменнай. Наглядным прыкладам гэтага служыць статут створанага 25 сакавіка 1911 года «Гродненского русского национального союза», дзе вызначаны наступныя мэты яго дзейнасці:

«а) панаванне рускай народнасці ў межах рускай зямлі, у прыватнасці, Гродзенскай губерні;

б) умацаванне свядомасці рускага народнага адзінства;

в) наладжванне рускай бытавой самадапамогі і развіццё рускай культуры;

г) умацаванне рускай дзяржаўнасці на аснове самадзяржаўнай улады цара ў яднанні з заканадаўчымі народнымі прадстаўнікамі» [14, с. 40].

З мэтай падрыву нашанiўскага руху i адначасова пашырэння свайго ўплыву сярод праваслаўнага беларускага насельнiцтва гэтыя псеўдабеларускiя арганiзацыi з фiнансавай дапамогай мясцовых улад распачалi ў губернскiх гарадах Беларусi перыядычную выдавецкую дзейнасць.

Найбольш актыўнымi дзеячамi чарнасоценна-акцябрысцкiх арганiзацый у заходнiх губернях i iх органаў друку – часопiса «Крестьянин», газет «Минское слово», «Виленский вестник», «Окраины России», «Белорусская жизнь», «Северо-западная жизнь» i iнш. – з'яўлялiся чыноўнiкi Л. Саланевiч, Г. Шмiд, В. Цяплоў, П. Каранкевiч, С. Кавалюк, П. Бывалькевiч, Д. Скрынчанка. Яны патрабавалi ад урада закрыць «Нашу нiву», Беларусь называлi «исконно-русским краем», а беларускае праваслаўнае насельнiцтва – «западнороссами». Часопiс «Крестьянин» (орган аргашiзацыi заможнага праваслаўнага беларускага сялянства «Крестьянин», кiраўнiк С. Кавалюк) у артыкуле «Расiя для рускiх» зазначаў, што надышоў час гаварыць аб тым, што Расiя павiнна належаць рускiм i яны абавязаны ёю кiраваць: «Хочаш жыць з Расiяй, падпарадкоўвайся яе законам i ўладзе, не хочаш – гладкай дарогi, а ўпартасць можна ўцiхамiрыць сiлаю» [15, с. 2].

«Белорусское общество» (кiраўнiк Л. Саланевiч), якое выдзелiлася з «Крестьянина», ставiла ў якасцi галоўнай задачы «развiццё ў беларускай народнасцi самасвядомасцi на аснове рускай дзяржаўнасцi». Ужо ў першым нумары газеты «Белорусская жизнь» (9 лютага 1909 года), органе гэтай аргашiзацыi, абвяшчалася аб'яднанне ўсiх прадстаўнiкоў беларускай народнасцi без адрознення саслоўя, звання i веравызнання на адной нацыянальна-культурнай платформе. Беларусы называлiся самастойнай народнасцю, але iх роднай мовай абвяшчалася «мова Пушкiна i Гогаля» [16, с. 425].

З 1911 года «Белорусская жизнь» пачала выходзiць штодзённа. Выступаючы ад iмя беларускага народа, яна пiсала: «Нам перш за ўсё неабходна паставiць свае нацыянальныя задачы, самавызначыцца, аб'яднацца, арганiзавацца i згуртавацца як беларусам» [17, с. 1]. Але псеўдабеларуская, антынацыянальная маска газеты Л. Саланевiча была паслядоўна i аргументавана выкрыта «Нашай нiвай». У канцы 1911 года «Белорусская жизнь» поўнасцю адкiнула маскiроўку, змянiла назву на «Северо-западную жизнь» i разам з чарнасоценнымi газетамi адкрыта стала рупарам вялiкадзяржаўнага шавiнiзму ў заходнiх беларускiх губернях.

Аднак асаблiва актыўна выступала супраць нацыянальна-адраджэнскага руху беларусаў i развiцця беларускай лiтаратуры газета «Минское слово», якая выходзiла, пачынаючы з 1906 года, пад дэвiзам: «Цар, дума i народ. Расiя для рускiх. Свабода, парадак, праца i ўласнасць». Рэдактарам гэтай газеты быў прыбалтыйскi немец Г. Шмiд – фiгура адыёзная ва ўсiх адносiнах: служачы на расiйскiм ваенным флоце, ён выдаў немцам планы крэпасцi Кранштат, за што быў асуджаны на дзесяць гадоў катаргi. Аднак

Мікалай II памілаваў яго, пасля чаго Г. Шмід з'явіўся ў Мінску і ўзначаліў барацьбу супраць «беларускага сепаратызму». Сама праграма «Минского слова» найбольш выразна сведчыць аб рэакцыйным абліччы гэтай газеты: «Минское слово» з'яўляецца адзіным на ўвесь Паўночна-Заходні край рускім нацыянальна-перадавым органам друку, па-ранейшаму застаецца на варце непадзельнасці Расіі, інтарэсаў рускага насельніцтва – гістарычнага гаспадара краіны, праваслаўя і шырокага, свабоднага і мірнага развіцця духоўных і матэрыяльных сіл Расіі» [14, с. 42].

«Наша ніва» і беларускі адраджэнскі рух, які яна ўзначальвала, абвінавачваліся ў «мазенінстве» і апалячванні беларусаў. Чарнасоценцы заяўлялі, што адраджэнне беларускай літаратуры – гэта нібыта ні больш ні менш як «інтрыга» палякаў, якім патрэбны беларускі «сепаратызм», каб разбіць і аслабіць «літаратурнае і нацыянальнае адзінства, а праз гэта і палітычную магутнасць рускага народа» [18, с. 194].

У адпаведнасці з такім падыходам у «Минском слове» ў артыкуле «Новы паход на Беларусь» даказвалася, што «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча і «Скрыпка беларуская» Цёткі напісаны «на варварскім жаргоне» і носяць «ярка сацыялістычную афарбоўку» [19, с. 2]. Праз нейкі час на старонках таго ж «Минского слова» паведамлялася, што беларускія пісьменнікі маюць быццам бы паланізатарскія мэты, а беларусы не разумеюць мову, на якой напісаны кнігі «рознымі Цёткамі, Янкамі Неслухоўскімі, Францішкамі Багушэвічамі і іншымі самазванымі "песнярамі"» [20, с. 2]. А вось як сустрэла дадзеная газета з'яўленне першых беларускіх буквароў: «Дастаткова знаёмства з беларускімі "лемантарамі" апошняга часу, каб пераканацца ў тым, што палякі ў стварэнні "беларускай мовы" і яе прапагандзе бачаць сродак для апалячвання беларусаў» [14, с. 44].

Гэтыя паклёпніцкія паведамленні паўтарала і сталічная перыёдыка: «У мэтах палітычнай агітацыі ў польскім кірунку распаўсюджваюцца кніжкі і газеты, а таксама польскі буквар у выглядзе "лемантара" (беларускага буквара), беларускія выданні ў польскім напрамку адстойваюць польскую справу і падбухторваюць супраць урада» [21, с. 2].

У 1913 годзе на кніжным рынку з'явілася і рэлігійна-багаслоўская літаратура, надрукаваная лацінкай на беларускай мове ў выдавецтве «Беларус». Але і яна была сустрэта чарнасоценным друкам падобнымі нападкамі.

Патрэбна адзначыць, што царская цэнзура лепш ведала, з кім мае справу. Да забароны беларускай кнігі яна падыходзіла з пэўнай дыферэнцыяцыяй. Каталіцка-багаслоўскай і дыдактычнай літаратуры, дзе грамадскія падзеі атрымлівалі афіцыйнае тлумачэнне, ніякіх пярэчанняў не было. Затое беларуская рэалістычная кніга, дзе адлюстроўвалася праўда жыцця, узнімаліся сацыяльныя і агульна-дэмакратычныя праблемы і пытанні развіцця нацыянальнай культуры і асветы, як правіла, падвяргалася забароне.

Увогуле газеты «Минское слово», «Северо-западная жизнь», «Виленский вестник», часопіс «Крестьянин» – самая змрочная старонка ў гісторыі перыёдыкі краю. Гэтыя выданні асабліва зацята выступалі супраць дэмакратычных змен, распальвалі нацыянальную варожасць, не прызнавалі права беларускага народа на развіццё сваёй культуры, звярталіся да правакацый і даносаў.

У такім жа напрамку, толькі з польскай арыентацыяй, супраць беларускага нацыянальнага адраджэння змагаліся польскія памешчыцка-клерыкальныя групоўкі. У гады рэвалюцыі (1905–1906 гады) у Вільні выдавалася 11 польскіх газет і часопісаў. Аднак падчас сталыпінскай рэакцыі колькасць іх скарацілася да 8–9 за кошт ліквідацыі левых выданняў. Затым адбыўся хуткі рост: у 1910 годзе польскамоўны друк у Вільні быў прадстаўлены 18, а ў 1914 годзе – 28 перыядычнымі выданнямі. Разам з тым некаторыя газеты і часопісы выдаваліся ў асобных беларускіх гарадах. У пераважнай большасці ў дачыненні да беларусаў гэта былі шавіністычныя выданні. Падобна расійскаму ўрадаваму і чарнасоценна-акцябрысцкаму руху, яны адмаўлялі існаванне асобнага беларускага этнасу, адмоўна ставіліся да адраджэння беларускай мовы і навязвалі беларусам засвойванне і вывучэнне польскай мовы і культуры. Ігнаруючы натуральнасць і заканамернасць абуджэння беларускага нацыянальнага руху, гэтыя выданні сцвярджалі, што за ім стаіць інтрыга Масквы, што «Наша ніва» выдаецца за казённыя грошы з мэтай русіфікацыі беларусаў, якія быццам бы цягнуліся да польскай культуры [22, с. 21].

Найбольш рэакцыйныя газеты польскага друку («Slowo», «Kurjer Warszawski», «Prawda», «Gazeta Codzenna»), у публікацыях якіх адчувалася асаблівая нянавісць да беларускага народа і яго культуры, выступалі адзіным фронтам супраць беларускай літаратуры і беларускіх перыядычных выданняў. Выконваючы планы аб аднаўленні Польшчы з уключэннем беларускіх зямель, яны стараліся даказаць, што нібыта няма ні Беларусі, ні беларускага народа, ні беларускай мовы, ні, тым больш, беларускай літаратуры. Напрыклад, польскі пісьменнік З. Пяткевіч у артыкуле пра купалаўскую «Адвечную песню» сцвярджаў: «Беларускі народ ніколі не меў і не мае сваёй літаратуры. Стварыла яе польская інтэлігенцыя. Створана яна штучным чынам, у значнай меры не адлюстроўвае ні душы, ні яго звычаяў, традыцый, вераванняў, ні нават складу яго мовы» [23, с. 2].

Такім чынам, польскія памешчыцка-клерыкальныя групоўкі, маючы добра сфарміраваную нацыянальную культуру, уласную эліту, імкнуліся пашырыць свой уплыў у беларускіх губернях, што вымушала іх весці барацьбу не толькі супраць антынацыянальнай палітыкі царызму, але і супраць беларускага адраджэнскага руху.

Характэрнымі рысамі акрэсленага вышэй перыяду з'яўляліся нарастание рэакцыі, выпрацоўка мер паліцэйскага нагляду за распачатымі працэсамі беларускага адраджэння, распаўсюджванне вялікадзяржаўных

прарасійскіх настрояў сярод беларускага насельніцтва. Гэтыя падыходы для самадзяржаўя мелі адзіную мэту – захаваць непарушным існуючы сацыяльны і дзяржаўны лад і пераадолець глыбокі крызіс, у якім аказалася расійскае грамадства пасля рэвалюцыі 1905–1907 гадоў.

Царызм, абапіраючыся на ідэалогію «заходнерусізма», праводзіў у адносінах да беларускага народа палітыку вялікадзяржаўнага шавінізму. Не без удзелу «заподноруссов» забаранялася ўжыванне беларускай мовы ў школах, адбываліся сістэматычныя нападкі на беларускі адраджэнскі рух на чале з «Нашай нівай». Пры гэтым палітыка самадзяржаўя на беларускіх губернях, накіраваная на раскол беларускага этнасу па веравызнанні на «рускіх» і «палякаў», поўнасцю задавальняла і мясцовыя польскія памешчыцка-клерыкальныя групоўкі. Па гэтым пытанні з чарнасоценна-акцябрысцкімі арганізацыямі ў іх было поўнае разуменне. У дачыненні ж да Беларусі і беларускага адраджэнскага руху абедзве групоўкі адносіліся з непрыкрытай варожасцю. Праз свой друк яны выступалі супраць беларускай культуры, не прызнавалі беларускі этнас.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Довнар-Запольский, М. В.* Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Минск: Изд-во Госплана БССР, 1926. – 240 с.
2. Национальный исторический архив Беларуси, г. Минск (НИАБ). – Фонд 295. – Вон. 1. – С. 7509, ч. VI.
3. НИАБ. – Фонд 295. – Вон. 1. – С. 7611.
4. *Забаўскі, М. М.* Палітычная барацьба ў Беларусі ў перыяд выбараў у III Дзяржаўную думу / М. М. Забаўскі // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. – 1987. – № 5. – С. 74–82.
5. НИАБ. – Фонд 295. – Вон. 1. – С. 7509, ч. VII.
6. Перадавіца // Наша ніва. – 1911. – 21 крас.
7. З Беларусі і Літвы // Наша ніва. – 1911. – 26 мая.
8. Перадавіца // Наша ніва. – 1912. – 18 ліп.
9. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
10. *Божелко, Т.* Нашей ниве / Т. Божелко // Крестьянин. – 1909. – 17 мая.
11. З гісторыяй на «Вы»: артыкулы, дакументы, успаміны. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 347с.
12. Сборник программ политических партий в России. – СПб., 1906. – Вып. 2. – 87 с.
13. НИАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – С. 7509, ч. VI.
14. *Цуба, М. В.* Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 г.). Матэрыялы да курса «Гісторыя Беларусі» / М. В. Цуба. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова. – 196 с.
15. Россия для русских // Крестьянин. – 1909. – 24 марта.

16. *Біч М. В.* Барацьба за нацыянальнае адраджэнне: нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. В. Біч; пад рэд. М. П. Касцюка. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 528 с.

17. Передовая статья // Белорусская жизнь. – 1911. – 2 студ.

18. *Александровіч, С. Х.* Пуцявіны роднага слова (праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя) / С. Х. Александровіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1971. – 248 с.

19. *Белорус.* Новый поход на Белоруссию / Белорус // Минское слово. – 1908. – 4 мая.

20. *Божелко, Т.* О книжном белорусском языке / Т. Божелко // Минское слово. – 1908. – 5 июля.

21. *Эльфи.* Польские когти в Белой Руси / Эльфи // Окраины России. – 1909. – 2 авг.

22. *Біч, М. В.* Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. Гістарычныя асаблівасці, узаемаадносіны з іншымі народамі / М. В. Біч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 29 с.

23. «Prawda». – Warszawa, 1910. – № 39.

**(Дата паступлення: 13.09.2017).**

## СОДЕРЖАНИЕ

*Шимукович Сергей*. БЕЛОРУССКИЕ РЕГИОНАЛЬНЫЕ ЭЛИТЫ ПЕРИОДА «ДОЛГОГО XIX ВЕКА» КАК ПРЕДМЕТ ИСТОРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ: ОБОСНОВАНИЕ ПОНЯТИЯ ........ 3

*Загорнов Александр*. ВОЛОСТНОЕ ПРАВОСУДИЕ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX ВЕКА: ОРГАНИЗАЦИОННО-ПРАВОВОЙ АСПЕКТ ........ 12

*Сыцько Кірыл*. КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЖЫЦЦЯ КАТАЛІЦКІХ ПАРАФІЙ БЕЛАРУСІ НАПРЫКАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ........ 17

*Киселёв Александр*. СТАТУС ОБЩЕЙ ПОЛИЦИИ В СОСТАВЕ БЮРОКРАТИЧЕСКОЙ ЭЛИТЫ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ (КОНЕЦ XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА) ........ 26

*Мацюш Павел*. МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ І ІХ УПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА ........ 31

*Мяньчэня Сяргей*. ПІЦЕЙНЫ ГАНДАЛЬ І СПАЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ Ў МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ГАДЫ «ВІННАЙ МАНАПОЛІІ» (1897–1914 ГАДЫ)........ 36

*Шевкун Павел*. ОТ ТРАДИЦИИ К МОДЕРНУ: КОММУНИКАТИВНЫЙ АСПЕКТ ИСТОРИИ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА) ........ 44

*Мастяница-Станкевич Ольга*. ИНТЕЛЛИГЕНЦИЯ «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»: НОВЫЕ ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ И МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ НАПРАВЛЕНИЯ ИССЛЕДОВАНИЙ В ЛИТВЕ ........ 53

*Арпентьева Мариям*. БЕЛОРУССКИЙ ФОЛЬКЛОР В ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ НАРОДА ........ 59

*Бруханчик Екатерина*. РОССИЙСКАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ О ПРОБЛЕМЕ ВЛИЯНИЯ ИНОСТРАННЫХ КАПИТАЛОВ НА СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ФИНАНСОВО-КРЕДИТНОЙ СИСТЕМЫ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XIX – НАЧАЛА XX ВЕКА........ 66

*Воронович Виталий*. ПРОБЛЕМА БЕЛОРУССКИХ БЕЖЕНЦЕВ В ПЕРИОД ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ: ФОРМАЛИЗМ, ФОРМАЛИЗАЦИЯ, ПОСЛЕДСТВИЯ И УРОКИ........ 75

*Гушчынскі Ігар*. ПРАВЯДЗЕННЕ РАСІЙСКАЙ СУДОВАЙ РЭФОРМЫ 1864 ГОДА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (У КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫКІ

ІМПЕРСКІХ УЛАД ПА ЎНІФІКАЦЫІ КРАЮ З УНУТРАНЫМІ ГУБЕРНЯМІ) ........ 81

*Ерашэвіч Аляксандр.* БЕЛАРУСКІЯ ГУБЕРНІ Ў СІСТЭМЕ АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1770–1790-Я ГАДЫ ........ 88

*Мигун Дмитрий.* НОЯБРЬСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ 1918 ГОДА В ГЕРМАНИИ И БЕЛАРУСЬ ........ 101

*Паноў Сяргей.* СУЧАСНЫ ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН: ДЫДАКТЫЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ........ 110

*Саракавік Іван.* І. М. ДАНІЛОВІЧ – АДЗІН З АКТЫЎНЕЙШЫХ ПАЧЫНАЛЬНІКАЎ АЙЧЫННАЙ НАВУКОВАЙ ЮРЫСПРУДЭНЦЫІ ........ 118

*Хадасевич Анна.* К ВОПРОСУ О ПОЛОЖЕНИИ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1920–1930-Е ГОДЫ ........ 127

*Цуба Міхаіл.* СТАЎЛЕННЕ САМАДЗЯРЖАЎЯ І ПРАВЫХ ШАВІНІСТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ Ў 1907–1914 ГАДЫ ........ 138

*Андруцкая Татьяна.* ИЗУЧЕНИЕ ПРАКТИКИ ДВОРЯНСКОГО САМОУПРАВЛЕНИЯ В СОВРЕМЕННОЙ РОССИЙСКОЙ ИСТОРИЧЕСКОЙ НАУКЕ ........ 148

*Гвардиян Сергей.* СОВРЕМЕННЫЕ ИССЛЕДОВАНИЯ ПО ВОЕННОЙ ИСТОРИИ РОССИИ XIX – НАЧАЛА XX ВЕКА: РЕГИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ ........ 156

*Кароль Маргарыта.* СУПРАЦІЎЛЕННЕ ПЕРАВОДУ Ў ПРАВАСЛАЎЕ КАТАЛІЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 ГАДОЎ: ВОБРАЗ «ПАДБУХТОРШЧЫКАЎ» У РАСІЙСКІМ АФІЦЫЙНЫМ ДЫСКУРСЕ ........ 165

*Карпечанка Ганна.* САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ МАЁНТКАЎ ТЫШКЕВІЧАЎ У XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ ........ 174

*Кейко Юлия.* ЦЕРКОВНЫЕ СОВЕТЫ ГРОДНЕНСКОГО УЕЗДА В 1860-Е ГОДЫ: ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ АСПЕКТ ........ 187

*Мосейчук Людмила.* РАЗВИТИЕ УНИАТСКОГО ДУХОВНОГО ОБРАЗОВАНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В XVIII – ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ XIX ВЕКА В ПОЛЬСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ........ 195

*Середа Артём.* ПОРЯДОК СОСТАВЛЕНИЯ УСТАВНЫХ ГРАМОТ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ В 1861–1862 ГОДАХ ........ 199